Справа выбару

Грамадска-адукацыйны праэкт

Модуль

6



# ТЭХНАЛОГІІ Ў ВЫБАРАХ

~ 2 мінуты, 4 старонкі

# ПРЫНЦЫПЫ

Сёння амаль у кожнага ёсць мабільны тэлефон, мы даўно карыстаемся інтэрнэт-банкінгам, а сацыяльныя сеткі сталі сферай нармальных штодзённых зносін. Тэхналогіі шырока выкарыстоўваюцца і ў выбарах. Таму ў гэтым модулі мы пагаворым аб плюсах і мінусах выкарыстання  тэхналогій, аб тых задачах, якія яны вырашаюць, і аб рызыцы, якую яны нясуць.

А на нашым сайце vybar.org вы знойдзеце яшчэ больш інфармацыі аб тым, чаму сумленныя выбары і дэмакратыя — гэта наша светлая будучыня. Дарэчы, падпішыцеся на гэты канал.

**ВЫБАРЫ — ГЭТА НЕ ТОЛЬКІ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ І ПАДЛІКУ ГАЛАСОЎ**

У модулі 5 мы ўжо абмяркоўвалі, што выбарчы працэс можна ўмоўна падзяліць на перадвыбарчы, выбарчы і поствыбарчы перыяды. У кожным з гэтых перыядаў тэхналогіі могуць адыгрываць вырашальную ролю.

Давайце разбяромся з некаторымі міфамі аб выкарыстанні тэхналогій у выбарчым працэсе.

# МІФ ПЕРШЫ: ТЭХНАЛОГІІ ДАПАМАГАЮЦЬ СТВАРЫЦЬ ДАВЕР ДА ВЫБАРАЎ

Існуе меркаванне, што калі выдаліць чалавечы фактар з выбарчага працэсу, то бок адхіліць ад яго людзей, то выбарам можна будзе давяраць, паколькі машыны не ўмеюць лічыць няправільна.

Гэта вялікая памылка.

## ЗА КОЖНАЙ ТЭХНАЛОГІЯЙ СТАІЦЬ КОД І ЧАЛАВЕК, ЯКІ ЯГО СТВАРЫЎ

Апроч гэтага, менавіта людзі канчаткова вырашаюць, прымаць ці не прымаць вынікі галасавання і што рабіць у спрэчных выпадках. Некаторых праблем можна пазбавіцца шляхам аўдыту і сертыфікацыі праграмнага забеспячэння, а таксама шляхам выкарыстання адчыненага кода. Кожны з гэтых падыходаў, зрэшты, пагражае стварэннем уразлівасцяў, якімі могуць скарыстацца хакеры ці замежныя дзяржавы.

Самай сур’ёзнай праблемай застаецца тое, што практычна ніхто з выбарцаў не будзе разумець, як працуюць тэхналогіі. Падумайце самі, наколькі дэталёва вы разумееце, што такое блокчэйн ці якія асноўныя метады шыфравання можна выкарыстоўваць у выбарах.

Дарэчы, праз адукацыйны курс на сайце "Справа Выбару"  вы можаце даведацца, чаму дэмакратыя не існуе без сумленных выбараў.

Часта здараецца так, што калі ў кагосьці застаюцца сумневы ў сумленнасці выбарчага працэсу, то падазрэнне падае ў першую чаргу на не да канца зразумелыя тэхналогіі. У Нямеччыне Канстытуцыйны суд у 2005 годзе вызначыў, што выкарыстанне тэхналогій у выбарах павінна быць такім, каб кожны крок галасавання і падліку галасоў мог верыфікаваць любы выбарца без спецыяльных ведаў.

# МІФ ДРУГІ: ТЭХНАЛОГІІ Ў ВЫБАРАХ НАСТОЛЬКІ ПРАСУНУТЫЯ, ШТО ПАМЫЛАК БЫЦЬ НЕ МОЖА

Важна яшчэ і тое, што машыны даюць збоі. Дастаткова ўспомніць сітуацыю 2000 года ў ЗША, калі галасы на прэзідэнцкіх выбарах прыйшлося пералічваць з-за таго, што машыны для галасавання спрацавалі дрэнна. Нават калі выкарыстоўваюцца больш сучасныя камп'ютары, яны таксама могуць састарэць, асабліва па прычыне хранічнага недафінансавання захоўвання і апгрэйдаў, якое зараз ёсць шмат у якіх краінах. Напрыклад, у Беларусі.

## МАШЫНЫ ДАЮЦЬ ЗБОІ

Акрамя гэтага, існуе вялікая рызыка хакерскіх нападаў і ўзлому дадзеных. Пасля 2016 года ў Францыі з-за тэхнічнай рызыкі адмянілі магчымасць галасавання праз інтэрнэт для грамадзян, якія жывуць за мяжой. У Галандыі быў выпадак, калі пададзены выбарцам голас на машыне для галасавання можна было падглядзець з адлегласці 5 метраў, выкарыстоўваючы звычайнае радыё.

# МІФ ТРЭЦІ: УСЁ БОЛЬШ КРАІН ГАЛАСУЮЦЬ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

Насамрэч толькі ў Эстоніі існуе магчымасць для кожнага грамадзяніна прагаласаваць праз інтэрнэт. Але і там на апошніх выбарах такой магчымасцю скарысталася толькі палова выбарцаў, астатнія прыйшлі на ўчасткі. Эстонская сістэма дапускае, што кожны можа адмяніць свой голас, пададзены праз інтэрнэт, калі прыйдзе на ўчастак. Гэта застаецца адзінай абаронай ад магчымага прымусу выбарцаў.

У Швейцарыі магчымасць галасаваць праз інтэрнэт тэстуюць ужо 20 гадоў, у тым ліку двойчы на выбарах федэральнага ўзроўню. Канчатковае рашэнне аб тым, ці будзе выкарыстоўвацца інтэрнэт-галасаванне ў будучыні, яшчэ не прынятае з-за рызыкі для бяспекі і кошту гэтага рашэння. У Расіі незалежны аналіз галасавання праз інтэрнэт прадэманстраваў, што тэхналогіі можна выкарыстоўваць і для фальсіфікацыяў.

**У МНОГІХ КРАІНАХ ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЦА НЕ ІНТЭРНЭТ-ГАЛАСАВАННЕ, А ТЭХНАЛОГІЯ СКАНАВАННЯ БЮЛЕТЭНЯЎ, ЯКАЯ ДАЗВАЛЯЕ ПАСКОРЫЦЬ ПРАЦЭС ПАДЛІКУ**

Пры выкарыстанні сканера кожны выбарца ставіць адзнаку ў папяровым бюлетэні звычайнай выявай, а потым апускае гэты бюлетэнь да урны праз сканер, які счытвае і запісвае адзнаку. Гэта больш таннае і эфектыўнае рашэнне, якое таксама дае магчымасць пералічыць бюлетэні ў выпадку скаргаў або сумневаў у сумленнасці падліку.

# ПАДВЯДЗЕМ ВЫНІКІ

Усе гэтыя абмежаванні і рызыка для галасавання праз інтэрнэт ці іншым чынам зусім не азначаюць, што трэба цалкам адмовіцца ад тэхналогій у выбарах.

Сучасныя тэхналогіі можна і трэба выкарыстоўваць на ўсіх стадыях выбарчага працэсу.

Можна рэгістраваць і ідэнтыфікаваць выбарцаў праз біяметрычныя дадзеныя.

Можна збіраць подпісы ў падтрымку кандыдатаў электронным спосабам.

Можна хутка падводзіць папярэднія вынікі выбараў на падставе звестак, атрыманых з выбарчых участкаў праз бяспечныя каналы камунікацыі.

Давер да выбарчага працэсу ствараецца не тэхналогіямі, а сумленнымі камісіямі, магчымасцю незалежнага назірання і павагай да правоў і свабод грамадзян.

Трэба заўсёды задаваць сабе пытанне, якія задачы мы спрабуем вырашыць, выкарыстоўваючы тэхналогіі? Колькі гэта будзе каштаваць і ці не створым мы сабе дадатковыя праблемы?

Выкарыстанне тэхналогій зусім не абавязкова павышае грамадскі давер да выбараў.

Галасаванне праз інтэрнэт і іншыя тэхналагічныя рашэнні не ёсць міравым трэндам.

Тэхналогіі патрабуюць пэўнага ўзроўню даверу да выбарчага працэса, бо далёка не кожны грамадзянін будзе разумець дэталі.

Выкарыстанне тэхналогій не абавязкова павінна быць звязанае з галасаваннем ці падлікам.

**ДА ВЫКАРЫСТАННЯ ТЭХНАЛОГІЙ ТРЭБА ПАДЫХОДЗІЦЬ УЗВАЖАНА І ЎЛІЧВАЦЬ МАГЧЫМУЮ РЫЗЫКУ. ДАВЕР ДА ВЫБАРАЎ БУДУЕЦЦА ГАДАМІ, А РАЗБУРЫЦЬ ЯГО МОЖНА ВЕЛЬМІ ХУТКА, КАЛІ НЕШТА ПОЙДЗЕ НЕ ТАК.**

Грамадска-адукацыйны праект «Справа выбару»
vybar.org

Справа выбару